# Берасцейскі ўніверсітэт

БрДУ падтрымлівае
Мэты ўстойлівага развіцця

**№ 3 (220)**
Выходзіць 1 раз у месяц
на беларускай і рускай мовах
**27 лютага 2018 года**

ВЫДАВЕЦ: Установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**


## Итоги Года науки подведены



**27 января на Совете университета, посвященном Дню науки, были подведены итоги работы за 2017 г. Совет констатировал положительную динамику в научном, учебно-методическом, идеологическом и воспитательном направлениях деятельности.**

Так, за прошедший период количество финансируемых НИР увеличилось с 30 до 35. Вырос и объем финансирования НИР – 132,64 тыс. бел. руб. (в 2016 г. – 103,4 тыс. бел. руб.). В прошлом году увеличилось число защищенных и утвержденных ВАК кандидатских диссертаций – их 7 (в 2016 г. – 6); защищены 2 докторские диссертации.

В 2017 г. проведена значительная работа по совершенствованию организационного обеспечения образовательного процесса. В частности, в 2017 г. разработано 218 изданий учебно-методического характера, из которых 18 имеют гриф Министерства образования или профильных УМО (в 2016 г. – 174, 17 из них имеют гриф Министерства образования или профильных УМО.

За истекший период в образовательный процесс внедрены 74 УМК (в 2016 г. – 66). Лидирующие позиции в подготовке подобных изданий занимает кафедра психологии.

За истекший период в образовательный процесс внедрены 74 УМК (в 2016 году – 66). Лидирующие позиции в подготовке подобных изданий занимает кафедра психологии.

Лидерами в научно-исследовательской работе стали кафедры истории славянских народов, теории и истории государства и права и географии и природопользования. В учебно-методической деятельности лучшими признаны кафедры психологии развития, общеобразовательных дисциплин и методик их преподавания и географии и природопользования.

Организация идеологической и воспитательной работы с обучающимися на многих кафедрах приобрела комплексный характер, о чем свидетельствуют традиционные мероприятия: университетский проект «Мастерская успеха» (кафедра педагогики), Пушкинский фестиваль «Друзья, прекрасен наш союз» (кафедра русской литературы и журналистики), межфакультетский сетевой контент-проект «Символы моей Беларуси» (кафедра прикладной математики и информатики) и др. Такой подход способствует продуктивному взаимодействию между субъектами образовательного пространства университета и социальными институтами города, области, республики.

Торжественным моментом Совета стала церемония награждения работников университета. Ректор Анна Сендер вручила знак «Отличник образования Республики Беларусь» кандидату педагогических наук, доценту кафедры педагогики Марии Ковалевич. Ряд представителей профессорско-преподавательского состава был отмечен Почетной грамотой Министерства образования, грамотами Министерства образования, почетными грамотами университета и благодарностями. Шести преподавателям были вручены дипломы доцентов.

Анна Николаевна поздравила присутствующих с достигнутыми успехами и выразила уверенность в том, что в 2018 году коллектив университета продолжит работать столь же плодотворно.

К поздравлениям ректора присоединились студенты, выступившие с замечательными музыкальными номерами.

## Сегодня в номере


***✔ «Молодежь и время: формула ответственности»***

В БрГУ состоялся открытый диалог студентов с депутатом городского Совета депутатов Надеждой Леонюк

**с. 2**

***✔Шчыра ўсміхацца людзям***

Уладзімір Сенькавец упэўнены, што ісці па жыцці з добрым настроем дапамагаюць адкрытая ўсмешка, пазітыўнае стаўленне да свету і любоў да наваколля

**с. 3**

***✔Жыць так, каб ні пра што не шкадаваць***

Вольга Маразюк лічыць: трэба смела глядзець наперад і верыць у свае сілы

**с. 4**

## ИЗ УСТ МОЛОДЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ



**Галина Богуш, учитель русского языка и литературы Скоковской СШ:**

– Как перед любым студентом-бюджетником, передо мной стоял вопрос распределения. Конечно, хотелось найти место работы в Бресте. Но мои самостоятельные поиски не увенчались успехом.

К счастью, система распределения в нашем университете работает отлично. Я получила распределение в Скоковскую среднюю школу, что недалеко от Бреста. Декан факультета Татьяна Васильевна Сенькевич с пониманием отнеслась к каждому студенту: искала вакансии, учитывая наши пожелания, а это при том, что некоторые студенты долго не могли определиться, где хотят работать. Благодаря усилиям факультета, первые рабочие места получили все выпускники.

Особая благодарность ректору Анне Николаевне Сендер. Во время процедуры распределения она поддерживала нас, внимательно относилась к каждому.

Я ни на минуту не пожалела, что работаю в деревне. У меня есть дополнительные бонусы: доплата молодому специалисту, доплата за сельскую местность, помощь с жильем, если возникнет необходимость.

Важно, что после окончания учебы связи с университетом не оборвались. После первых недель работы мне звонили и интересовались, как я устроилась. Все мои страхи и переживания оказались напрасными. Здорово, что в университете каждому студенту помогают в поисках первого рабочего места.

# «Молодежь и выборы: формула ответственности»

**18 января в нашей стране проходили выборы в местные Советы депутатов XXVIII созыва. В университете в преддверии этого важного события состоялась встреча студентов с депутатом XXVI и XXVII созывов городского Совета депутатов, деканом социально-педагогического факультета Надеждой Леонюк.**

**Среди обучающихся в университете много тех, кому предстояло впервые осуществить избирательное право, закрепленное в Конституции нашей страны, поэтому тема диалога была определена так – «Молодежь и выборы: формула ответственности».**



Цель выступления Надежды Александровны состояла в том, чтобы повысить грамотность студенческой молодежи в этом важном вопросе.

Надежда Александровна рассказала обучающимся о специфике местного самоуправления и задачах, которые стоят перед депутатами. «Депутаты представляют интересы своих округов в Совете депутатов, поэтому постоянно взаимодействуют с гражданами: проводят личные приемы, способствуют разрешению проблемных ситуаций, рассматривают обращения, выступают в СМИ и т.д., – отметила она. – Приоритет деятельности депутата – работа с людьми, внимание к потребностям и нуждам каждого во имя общего блага».

Член молодежной информационной группы ПО РОО «Белая Русь», председатель старостата филологического факультета Андрей Нестерук и временно исполняющий обязанности секретаря ПО ОО «БРСМ» университета Елена Дашкевич рассказали о специфике расходов местных бюджетов и основных направлениях государственной молодежной политики.

Участие в голосовании – гражданский долг каждого из нас. Мы должны быть заинтересованы в том, чтобы в Советы депутатов пришли достойные, компетентные люди, способные выполнить волю народа и оправдать его доверие.

*Юлия Вовк*

## УНИВЕРСИТЕТ В ЛИЦАХ

# Шчыра ўсміхацца людзям

**Кандыдат філалагічных навук, дацэнт Уладзімір Адамавіч Сенькавец з дзяцінства захапляўся прыгожым пісьменствам. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Марыя Мікалаеўна Апановіч амаль што “за руку” прывяла таленавітага хлопца ў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут, бо другой дарогі, акрамя філалогіі, яна не бачыла для Уладзіміра. Марыя Мікалаеўна не памылілася: у БрДУ Уладзімір Адамавіч атрымаў прафесію, да якой змалку хіліўся сэрцам, і стаў настаўнікам для моладзі, улюбёнай у паэтычнае слова.**

**Яго з вялікім задавальненнем слухаюць студэнты. А ўсё таму, што ён высокаадукаваны чалавек з шырокім кругаглядам: з ім заўсёды побач і слова, і песня, і танцы, і тэатр, і фатаграфія… На занятках у выкладчыка пануе атмасфера суразмоўя і пошуку ісціны.**

**– Уладзімір Адамавіч, дзе і як пачынаўся Ваш працоўны шлях?**

– Пасля заканчэння інстытута я дзве змены працаваў у піянерскім лагеры. У верасні мяне накіравалі на працу дырэктарам Копанскай васьмігодкі Столінскага раёна. Я вельмі хваляваўся, але педагагічны калектыў усяляк дапамагаў мне. Праз некалькі месяцаў прыйшла павестка ў армію.

У 1981 годзе мне прапанавалі працаўладкавацца на ТРК “Брэст”, аднак гэтыя планы не здзейсніліся, і я паехаў працаваць дырэктарам Востраўскай васьмігадовай школы Пінскага раёна. Гэта быў вельмі цікавы і творчы перыяд. Я пазнаёміўся з многімі людзьмі, набыў вопыт кіраўніка, павысіў сваё педагагічнае майстэрства.

У гэты час вёў перапіску з Уладзімірам Андрэевічам Калеснікам. У адным з лістоў ён і запрасіў мяне на працу ў родны інстытут.

Добра памятаю, што гэта для мяне было сур’ёзнае рашэнне. Я, нікому нічога не сказаўшы, паехаў у Брэст, дзе працую ўжо амаль 36 гадоў.

**– Што самае важнае ў Вашай прафесіі?**

– У любой прафесіі самае важнае – адданасць справе. Важна не проста ісці на працу, таму што так трэба, а атрымліваць ад яе задавальненне.

Галоўнымі якасцямі выкладчыка, на маю думку, з’яўляюцца прафесіяналізм і стасункі з людзьмі. Чалавек павінен адносіцца да людзей так, каб яго разумелі і паважалі, і сам павінен з павагай і разуменнем ставіцца да іншых. Гэта маё жыццёвае крэда. А яшчэ ўпэўнены, што трэба шчыра ўсміхацца людзям.

Што датычыцца студэнтаў, то яны не вельмі змяніліся – змяніўся час, а вялікія магчымасці развівацца засталіся, іх нават болей стала. У нашым універсітэце працуе многа гурткоў, секцый, студый, у якіх актыўныя людзі могуць займацца. Важна, каб чалавек адчуваў сябе часткай калектыву, а калектыў бачыў у гэтым чалавеку індывідуальнасць, асобу.

Студэнцкае жыццё цікавае, яго трэба выкарыстоўваць напоўніцу. Але і памятаць пры гэтым, што на першым месцы ў студэнта – вучоба, праз якую ён пазнае сакрэты будучай прафесіі, становіцца паўнавартасным спецыялістам.

**– Якія метады Вы выкарыстоўваеце ў сваёй працы?**

– Новыя падыходы, методыкі, прыёмы заўсёды былі адной з задач развіцця навукі. Я не вялікі аматар таго, каб неасэнсавана пераходзіць да новага – ім спачатку патрэбна добра авалодаць, а на гэта патрабуецца не дзесяць хвілін, не тыдзень і не месяц.

Перакананы: нішто не заменіць жывыя зносіны, слова выкладчыка, асабліва пры падрыхтоўцы настаўнікаў. Аднак старацца авалодаць новымі сродкамі трэба, каб размаўляць са студэнтамі на “адной мове”, ісці ў нагу з часам.

**– З вышыні свайго вопыту ацаніце сучасную сістэму адукацыі.**

– Я лічу, што стаўленне да адукацыйнага працэсу ў нашай краіне вельмі сур’ёзнае. Сучасная сістэма адукацыі сябе зарэкамендавала някепска. Адзінае, што выклікае занепакоенасць, – частыя змены, эксперыменты.

Не вельмі падабаецца мне і тое, што адбываецца са школьнай праграмай па беларускай літаратуры. Многія пісьменнікі з праграмы выключаны, некаторыя прадстаўлены творамі, якія не маюць высокай мастацкай вартасці. На маю думку, дамінантным крытэрыем, якім павінны карыстацца складальнікі праграм па беларускай літаратуры, павінен быць высокі мастацкі ўзровень твораў. Ён убірае ў сябе як пазнаваўчыя, так і выхаваўчыя аспекты.

Але зразумела, што адукацыйная сістэма не павінна быць закамянелай, яна абавязана рэагаваць на запатрабаванні часу.



**– Уладзімір Адамавіч, Вашы дзеці пайшлі па Вашых слядах?**

– Сын скончыў наш філалагіны факультэт, быў на стажыроўцы за мяжой, працаваў у гімназіі, пасля чаго пайшоў у армію. Потым працаваў лінгвістам у следчым камітэце, а зараз заняты ў камерцыйнай структуры. Філалагічная адукацыя дала яму вельмі многа: уменне наладжваць кантакт з людзьмі, граматна і прыгожа гаварыць, веданне моў.

Дачка вучылася на спецыяльнасці “Бізнес-адміністраванне” нашага юрыдычнага факультэта. Сёння працуе па спецыяльнасці. Яна таксама добра валодае некаторымі замежнымі мовамі, што вельмі дапамагае ёй у працы і жыцці. Па сваім складзе яна ўсё ж філолаг.

**– Якія мэты стаяць перад Вамі сёння?**

– У мяне шмат задумак. Напрыклад, напісаць кнігу пра свой час, родных, сяброў, калег, выдаць альбом уласных фотаздымкаў. А яшчэ – дапамагаць выхоўваць унукаў.

*Вікторыя Паўлючэнка*
*(філалагічны факультэт)*

## УНИВЕРСИТЕТ В ЛИЦАХ

# Жыць так, каб ні пра што не шкадаваць

**Студэнтка трэцяга курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці “Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)” Вольга Маразюк пачала нашу гутарку так: «Колькі сябе памятаю, у дзяцінстве заўсёды з задавальненнем гуляла ў “школу”». Яна збірала ў сябе дома сяброў, размяшчала «вучняў» за імправізаванымі партамі і, каб не бачылі бацькі, выкарыстоўвала ў якасці школьнай дошкі... шафу. “Часам праводзіла ўрокі і для лялек”, – успамінае дзяўчына першыя “настаўніцкія” вопыты.**

**Сёння Вольга – старшыня савета студэнцкага самакіравання на філалагічным факультэце, з гонарам носіць званне «Студэнт года – 2017», прызёр рэспубліканскага агляд-конкурсу “АРТ-вакацыі”, адкрытага абласнога конкурсу патрыятычнай песні “Моладзь і час: подзвіг у імя будучыні”, універсітэцкага шоу “Голас” і інш.**



Оля нарадзілася ў вёсцы Навасёлкі Камянецкага раёна. “Я вучылася ў музычнай школе па класе сінтэзатара, займалася вакалам і танцамі, у сельскім Доме культуры ўдзельнічала ў тэатральных пастаноўках, – распавядае яна. – Марыла стаць актрысай…”.

Бацькі не падтрымалі жаданне дачкі, але прапанавалі кампраміс: паступаць на філалагічны факультэт, тым больш што Вольга скончыла абласны ліцэй імя П.М. Машэрава, дзе паглыблена вывучала мову.

Першыя дні ў ролі студэнткі дзяўчына адчувала сябе не вельмі камфортна, але добразычлівая атмасфера філфака дапамагла хутка асвоіцца. Студэнтка вырашыла цалкам прысвяціць сябе вучобе, не збіралася дэманстраваць свае творчыя здольнасці. Але калі даведалася, што на “Арт-сесію” не хапае нумароў, згадзілася дапамагчы групе – і яскрава выступіла на канцэрце. Так і пачалося яе займальнае, насычанае творчае жыццё.

“Я зразумела, што не трэба баяцца цяжкасцяў, трэба смела ісці наперад і верыць у свае сілы”, – распавядае Вольга. Дзяўчына з цікавасцю пачала рыхтавацца да конкурсу “Павер у сябе”. Яна ўпэўнена: чым больш чалавек загружаны, тым больш ён будзе паспяваць.

“Ведаю дакладна, што без падтрымкі дэкана факультэта Таццяны Васільеўны Сянькевіч і выкладчыка Уладзіміра Адамавіча Сенькаўца ў мяне нічога не атрымалася б”, – працягвае Вольга. – Я шчыра ўдзячна ім за падтрымку і веру ў мяне, мае сілы. За мудрасць і цярпенне дзякую Святлане Мікалаеўне Шчэрбе, за цёплыя словы – Алене Сцяпанаўне Кавалюк”.

Калі Вольга атрымала званне “Студэнт года”, на яе плечы легла яшчэ больш адказнасці: дзяўчына будзе прадстаўляць БрДУ на наступным этапе конкурсу, які адбудзецца восенню. А яшчэ ў хуткім часе – сур’ёзная падрыхтоўка да чарговых “Арт-вакацый”.

“Думаю, я зноў добра выступлю, таму што мне дапамагае Іна Іванаўна Неўдах, педагог-арганізатар студэнцкага клуба, прафесіянал, – упэўнена Оля. – Яна заўсёды настройвае на перамогу, але пры гэтым вучыць не хваляваецца, калі нешта не атрымліваецца, аналізаваць памылкі і працягваць працаваць над сабой”.

Вольга не верыць, што яе яркае студэнцтва хутка скончыцца. Ужо ў наступным годзе яна будзе здаваць дзяржаўныя экзамены і абараняць дыпломную працу.

Працаваць Оля хоча літаратурным супрацоўнікам або журналістам, але паспрабаваць свае сілы ў навучанні школьнікаў таксама плануе. “Я пакуль не вызначылася, бо лічу, што жыццё павінна быць афарбавана ў розныя колеры, яго трэба пражыць так, каб потым ні пра што не шкадаваць”, – заключыла студэнтка.

**Мая любімая кніга –**
«Партрет Дориана Грея» О. Уайльда.
**Я люблю, калі**
мяне любяць.
**У людзях я цаню**
дабрыню.
**Мяне раздражняе, калі**
спазняюцца.
**Ва ўніверсітэце мне больш за ўсё падабаецца**
актыўная творчая дзейнасць.
**Самае галоўнае ў жыцці –**
здароўе.

*Юлія Воўк*

«Берасцейскі ўніверсітэт» № 3 (220) люты 2018 г.

**Рэдакцыя:** рэдактар – Ю.Б. Воўк, тэл. 21-65-64.
Фота – Г. Лубнік.
Куратар газеты – Л.В. Скібіцкая.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА
БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.
Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.

E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 27.02.2018.
Аб’ём 1,0 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 38.
ЛП № 02330/454 ад 31.12.2013.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***